УДК 373.5 : 821.161.1.09

# УРОКІ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ Ў V–VI КЛАСАХ

**Балахонава Наталля Фёдараўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва";

**Жвалевіч Таццяна Мікалаеўна**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі
"Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"
(г. Магілёў, Беларусь)

Пры вывучэнні літаратуры як школьнага прадмета, акрамя ведаў і ўменняў, павінен фіксавацца і ўзровень літаратурнай падрыхтоўкі. Задача ўрокаў беларускай літаратуры, у прыватнасці, – выхаванне новага чалавека, шматбакова развітай асобы, выхаванне ў вучняў высокай культуры маўлення. Удасканаленне літаратурнай адукацыі школьнікаў – важная састаўная частка работы школы па фарміраванні ўсебакова і гарманічна развітай асобы. Паводле А. Скакоўскай, культура мовы вучыць матываванаму выкарыстанню моўных сродкаў, без яе "нельга ўявіць гарманічную асобу, актыўную ў грамадстве" [4, с. 74–77].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Вялікае значэнне надаецца дадатковай літаратуры. Дадатковае чытанне дазваляе фарміраваць і развіваць чытацкія інтарэсы вучняў, паглыбляць літаратурную адукацыю школьнікаў. Рацыянальна арганізаваная на пачатковых этапах навучання інтэлектуальная дзейнасць, на думку А.М. Макарэвіча, спрыяе назапашванню не толькі фактычнай інфармацыі пэўнага кшталту, паступоваму фарміраванню ўменняў і навыкаў адпаведнай скіраванасці, але і ўзнікненню ў суб'екта такой упэўненасці ў сваіх сілах, жадання творча прымяняць назапашаныя веды і навыкі: "Паколькі ў сістэме літаратурнай адукацыі пяты клас з'яўляецца пераходным этапам ад пачатковага навучання да сярэдняга, то вельмі важна з самага пачатку яго здзяйснення вучыць пяцікласнікаў рацыянальнай арганізацыі працы з выхадам на развіццё іх творчых здольнасцей. Важна арыентаваць школьнікаў на тое, што ім спатрэбяцца вынікі іх працы і ў далейшым. Такі падыход павінен быць сістэмным" [2, с. 9–16].

"Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. 5–11 класы" вызначае колькасць гадзін на творчыя работы і акрэслівае "прыкладны спіс твораў для дадатковага чытання" [1, с. 22–23, 34–35], асноўны змест гэтых урокаў не прапануецца. У дапаможніку для настаўнікаў па прыкладным каляндарна-тэматычным планаванні "Беларуская мова і літаратура. 5–6 клас…" даюцца рэкамендацыйныя парады адносна творчых работ вучняў. Творы для дадатковага чытання праграма прапануе выбраць настаўніку [1]. Прытрымліваючыся меркавання А.М. Макарэвіча, хочацца заўважыць, што "варта было б пры гэтым вызначыць у планаванні пералік твораў для кожнага з чатырох урокаў па творах для дадатковага чытання з улікам тэматыкі, праблематыкі, вобразаў гэтых твораў, а таксама твораў з адпаведных раздзелаў вучэбнага дапаможніка" [3].

Урокі па творах для дадатковага чытання і ўрокі, на якіх выконваюцца творчыя работы, маюць на мэце фарміраванне творчых здольнасцей школьнікаў, іх мэтазгодна праводзіць у пятым-шостым класах чатырма парамі (1+1 гадзіна): урок па творах для дадатковага чытання і адразу пасля яго ўрок, на якім выконваецца творчая работа. Такая паслядоўнасць гэтых урокаў у падабенстве зместу форм дзейнасці вучняў на іх утварае своеасаблівы блок творчых урокаў. "Пары" гэтых блокаў паводле форм працы, іх зместу, тэматычнай скіраванасці твораў вучэбнага дапаможніка павінны быць узаемазвязаны з раздзеламі, у кантэксце якіх яны праводзяцца. Адпаведныя формы дзейнасці вучняў у межах гэтых блокаў, па-першае, спрыяюць падрыхтоўцы школьнікаў да больш эфектыўнай іх дзейнасці пры выкананні заданняў па творчых работах, па-другое , садзейнічаюць назапашванню падагульненняў, ілюстрацый да папярэдне вывучанага матэрыялу тых раздзелаў, пасля якіх праводзяцца "пары".

Пагаджаемся з А. М. Макарэвічам і ў тым, што "перспектыўнае планаванне ў пятым класе ўрокаў па вывучэнні твораў для дадатковага чытання і ўрокаў, на



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

якіх вучнямі выконваецца творчая работа, мэтазгодна здзяйсняць у наступнай паслядоўнасці: 1) для ўрокаў па творах для дадатковага чытання ў пятым класе прапануем наступныя тэксты: “Як сінячок да сонца лётаў” У Дубоўкі, “Цюцік” Я. Брыля, “Скрыпач і ваўкі” К. Каганца, “Чортаў скарб” У Караткевіча; 2) выбар тэм для творчых работ з улікам “асноўных відаў работ па літаратуры…”. Пры гэтым можна прыняць парады з прыкладнага планавання: а) вуснае выказванне на тэму “Мой родны кут, як ты мне мілы!”, б) падагульняючы ўрок-конкурс, в) вусная замалёўка на падставе ўласных назіранняў за прыроднымі з’явамі, д) разгорнуты адказ на пытанне з элементамі характарыстыкі літаратурнага героя па адным з вывучаных твораў [2, с. 9–16]; 3) вызначэнне блока творчых урокаў; 4) структураванне алгарытмаў працы настаўніка і вучняў на перспектыву: час і форма аб’яўлення заданняў на перспектыву, формы падрыхтоўкі да ўрокаў па творах для дадатковага чытання і ўрокаў, на якіх выконваецца творчая работа, перспектывы канкрэтных форм працы на ўроках па тэмах, вызначаных “Вучэбнай праграмай…”, пры выкананні дамашніх заданняў у кантэксце творчага выхаду на ўрокі па творах для дадатковага чытання і ўрокі, на якіх выконваецца творчая работа.

Этапы падрыхтоўкі да ўрокаў, на якіх выконваецца творчая работа, наступныя: а) аб’яўленне тэм і прыкладных планаў творчай работы ў самым пачатку працы з адпаведным раздзелам вучэбнага дапаможніка; б) назапашванне фактаў, фарміраванне адпаведных уменняў пры вывучэнні твораў; пры гэтым неабходна рабіць апорныя запісы ў літаратурных сшытках; в) невялікія творчыя дамашнія заданні да ўрокаў, на якіх будзе выконвацца творчая работа па адпаведных тэмах.

У працэсе планавання дзейнасці вучняў настаўнік павінен вызначыць час, калі шасцікласнікі змогуць звярнуцца да ўспрымання адпаведнага мастацкага твора з тым разлікам, каб да ўрока па творы для дадатковага чытання адпаведны тэкст быў не толькі імі прачытаны, а і асэнсаваны. Мэтазгодна задаваць вялікія творы на лета. За некалькі тыдняў варта зарыентаваць шасцікласнікаў на чытанне адпаведнага твора.

Заданні ў працэсе чытання твора агучваюцца, каменціруюцца і прапануюцца вучням у раздрукаваным варыянце. У заданнях і пытаннях мэтазгодна прыводзіць цытаты з адпаведнага твора. Гэта дапаможа школьнікам адшукаць неабходныя часткі, зарыентуе на выкарыстанне цытат ва ўласных выказваннях.

Практыка паказвае, што названыя этапы і формы працы па сістэме перспектыўных ліній спрыяюць падрыхтоўцы разгорнутай, доказнай характарыстыкі мастацкіх твораў на ўроках па творах для дадатковага чытання, а таксама паступоваму назапашванню неабходных ведаў і ўменняў для выканання творчых работ. Усё адзначанае садзейнічае фарміраванню ўменняў і навыкаў рацыянальнай арганізацыі працы вучняў на далейшых этапах навучання:



Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

рабіць доказныя характарыстыкі, ацэнкі твораў, іх літаратурных вобразаў, падбіраць матэрыял і эфектыўна яго выкарыстоўваць у творчых працах.

**Літаратура**


1. Вучэбная праграма для агунаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. Беларуская літаратура. 5-11 класы / зацв. Мін-вам адук. Рэсп. Беларусь. – Мінск : Нац. ін-т адук., 2012. – 127 с.
2. Макарэвіч, А. М. Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў 5-6 класах // Беларуская мова і літаратура. – 2013. – № 7. – С. 9–16.
3. Макарэвіч, А. М. Вывучэнне твораў беларускай дзіцячай літаратуры: урокі дадатковага чытання і творчыя работы ў 5-6 класах // Беларуская мова і літаратура. – 2013.– № 8. – С. 21–30.
4. Скакоўская, А. Кантэкстуальны падыход да вызначэння крытэрыяў літаратурнай адукацыі вучняў // Роднае слова. – 2010. – № 6. – С. 74–77.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова